# БЕЛАРУСКАЯ ЭТНАФІЛАСОФІЯ



**Ірына Дубянецкая,**
старшы навуковы супрацоўнік
Цэнтра гісторыка-філасофскіх
і кампаратыўных даследаванняў
Інстытута філасофіі НАН Беларусі,
доктар тэалогіі

У Інстытуце філасофіі ў 2019 г. пачалася навуковая праца ў межах асобнага праекта «Беларуская этнафіласофія ў сістэме нацыянальнай культуры», ініцыятарам і кіраўніком якога з'яўляецца кандыдат філасофскіх навук Сяргей Санько. Гэта даследаванне новае не толькі для беларускай філасофскай навукі – яно не мае паралелей у еўрапейскай гуманістыцы. Ідэя – у выяўленні і цэласным вывучэнні інтэлектуальных, светапоглядных і каштоўнасных асноў традыцыйнай беларускай культуры на аўтэнтычным фальклорна-этнаграфічным матэрыяле.

Для Беларусі навізна праекта палягае ў тым, што вусная народная творчасць разглядаецца як плён комплекснага асэнсавання і інтэрпрэтацыі свету сваім стваральнікам – народам. Гэта спроба ўзнавіць беларускую традыцыйную сістэму светамыслення і «прачытаць» яе як інтэлектуальную перадгісторыю краіны і яе народа на аснове цэласнай рэканструкцыі яго аўтэнтычнага светабачання, кагнітыўных асноў, сацыяльных мадальнасцей і аксіялагічных канцэптаў.

У міжнароднай практыцы гэта першая ў еўрапейскай і шырэй – заходняй навуцы спроба даследавання этнафіласофіі народа, належнага да еўрапейскай культуры.

Этнафіласофія ўзнікла ў другой палове мінулага стагоддзя як галіна культурнай антрапалогіі, і сам тэрмін традыцыйна прымяняецца найперш для даследавання светапоглядных асноў сучасных непісьмовых культур, якія не цалкам інтэграваныя ў сучасны высокатэхналагічны свет, або знаходзяцца на яго ўзбоччы. Даследаванні ў гэтым напрамку часта вядуцца ў ключы крытыкі еўропацэнтрызму і носяць адценне ідэі «вызвалення» (liberation, па аналогіі з тэалогіяй вызвалення) – гэта значыць незалежнасці абарыгенных народных філасофій ад дамінанты заходняй філасофіі, ад неабходнасці размаўляць на мове заходняй навукі, урэшце, ад нізкага статусу ў сучасным інтэлектуальным дыскурсе.

Прынцыповая навізна праекта «Беларуская этнафіласофія ў сістэме нацыянальнай культуры» палягае ў тым, што ён сфакусаваны на вывучэнні адной са «старых» еўрапейскіх культур. У дадатак да метадаў, распрацаваных «класічнай» этнафіласофіяй, даследаванне ўжывае метадалагічны інструментарый розных рэлевантных дысцыплін – семіётыкі культуры, кампаратыўнай міфалогіі, рэлігіязнаўства, кагнітыўнай лінгвістыкі, гістарычнага мовазнаўства, інтэлектуальнай гісторыі, філасофскай герменеўтыкі, канцэптуальнага і дыскурсіўнага аналізу ды інш.

З іншага боку, беларуская этнафіласофія жывіцца багатым матэрыялам, напрацаваным рознымі айчыннымі этнадаследаваннямі, якія пачыналіся сістэмным запісам фальклору ў XIX ст., працягваліся і развіваліся як акадэмічныя дысцыпліны праз усё XX ст. і набываюць новы імпэт у нашым часе, пераўзыходзячы вузкадысцыплінарныя рамкі і працуючы на скрыжаванні розных дысцыплін і метадалогій.

Беларускія акадэмічныя этнадаследаванні вылучаюцца сярод іншых сваім ахопам матэрыялу. Найлепшы прыклад – беспрэцэдэнтны збор вуснага фальклору ў адкрытай шматтомнай серыі «Беларуская народная творчасць» (БНТ), выдаванай Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі ад 1970 г., у якую на дадзены момант уваходзіць каля 50 кніг, укладзеных паводле жанра-

вага (радзей рэгіянальнага) прынцыпу. БНТ прадэманстравала выключную распрацаванасць і жанравую разнастайнасць нацыянальнага фальклору як найбагацейшай крыніцы для даследавання светапогляду беларусаў, і не толькі іх. Некаторыя паэтычныя жанры каляндарна-абрадавага цыкла захаваліся толькі ў беларускіх запісах, але відавочна, што яны сведчаць пра касмалагічныя ўяўленні ўсіх датычных народаў, і таму ўяўляюць асаблівую каштоўнасць для рэканструкцыі сакральных ведаў краін славянскага, балта-славянскага арэала, шырокага абсягу еўрапейскіх і інда-еўрапейскіх краін, а таксама для вывучэння трансмісіі ведаў і вераванняў у гэтым накірунку. Можа, нездарма еўрапейскія этнафіласофскія даследаванні пачынаюцца менавіта ў Беларусі, дзе такая значная колькасць акадэмічна апрацаваных аўтэнтычных фальклорных крыніц.

Праект «Беларуская этнафіласофія ў сістэме нацыянальнай культуры» мае на мэце выявіць значныя элементы беларускага традыцыйнага мыслення – канцэпты, тэмы, вобразы, а таксама светапоглядныя, кагнітыўныя і аксіялагічныя фарманты ўсяго комплексу народных ведаў пра свет, чалавека і грамадства. Перад вучонымі стаяць дзве асноўныя практычныя задачы. Па-першае, гэта збор матэрыялу. Неабходна сабраць, апрацаваць, класіфікаваць, суправадзіць навуковым каментаром, а таксама падрыхтаваць да друку корпус фальклорных запісаў, у якіх утрымліваецца інфармацыя пра светапоглядныя напрацоўкі беларускай народнай культуры, пра традыцыйную карціну свету і такія яе складнікі, як паходжанне і структура сусвету (этнакасмалогія), сфера сакральнага (этнатэалогія), чалавек і чалавечае жыццё (этнаантрапалогія), грамадства (этнасацыялогія), нормы паводзінаў і сістэма каштоўнасцей (этнааксіалогія), кагнітыўная сфера, сістэма ведаў і яе трансмісія (этнаэпістэмалогія, этнагнасеалогія) ды інш.

Другая задача – гэта інтэрпрэтацыя матэрыялу. На грунце паглыбленага даследавання традыцыйных тэм, паняткаў, вобразаў, ідэй, устойлівых асацыяцый і семіятычных сувязей паміж канцэптамі, іх вербальнага афармлення і г.д. неабходна ўзнавіць, наколькі гэта магчыма, цэласную сістэму і ўнутраныя структуры карціны свету і светамыслення беларускай традыцыйнай супольнасці, што, у сваю чаргу, будзе ключом да разумення нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. (Такая праца таксама можа быць скарыстана для глыбокага вывучэння гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі нашай краіны). Наступны крок да разумення народнай сацыяльнай ды інтэлектуальнай тоеснасці – гэта кантэкстуалізацыя беларускага аўтэнтычнага мыслення шляхам кампаратыўных даследаванняў, што дасць магчымасць асэнсаваць і ацаніць месца і ролю беларускай інтэлектуальнай традыцыі ў індаеўрапейскіх і не толькі часава-прасторавых узаемасувязях.

Першая фаза праекта завершаная. Сабрана значная база дадзеных, тэматычна класіфікаваных і сістэматызаваных, якая на гэты момант уключае больш за 8 тыс. запісаў фальклорных тэкстаў розных жанраў і этнаграфічных сведчанняў і працягвае папаўняцца. Апублікаваны шэраг артыкулаў, рыхтуецца калектыўная манаграфія. І дзеля ўвядзення новага этнафіласофскага дыскурсу ў шырокі культурны ўжытак удзельнікамі праекта ўкладзена і падрыхтавана да друку навукова-папулярнае выданне «Трошкі бліжэй ад Сонца і трошкі далей ад Месяца. Беларуская народная філасофія». Назва ўзятая з тэкстаў Уладзіміра Караткевіча, п’есы з падобнай назваю і казкі «Чортаў скарб», дзе апавядальнік сітуатызуе падзеі сваёй гісторыі «у нейкім прыгожым краі, трошкі бліжэй Сонца і трошкі далей ад Месяца… словам, у тым краі, дзе мы з табою жывём», пазначаючы такім чынам Беларусь. Кніга імкнецца комплексна прадставіць народнае мысленне як сістэмнае асэнсаванне свету, разуменне чалавека, норм паводзін, каштоўнасцей і г.д. Аднак канцэпцыя кнігі яшчэ больш складаная, бо ўлучае рэфлексію на народную філасофію і яе працяг і развіццё ў беларускім аўтарскім пісьменстве – пераважна ў мастацкай літаратуры, якая цягам стагоддзяў часта брала на сябе функцыю прафесійнай нацыянальнай філасофіі. Як і назва ўсёй кнігі, раздзелы і падраздзелы названы цытатамі з літаратуры, а кожны раздзел пачынаецца эпіграфамі з літаратурных твораў, якія прадстаўляюць прадмет абмеркавання, каментуюць народнае бачанне прадмета, развіваюць яго, задаюць яму новыя вымярэнні або спрачаюцца з гэтым бачаннем ці нават наўпрост пярэчаць яму. Аўтары



Героі касмічнага змагання. Ініцыял з Аршанскага Евангелля канца XII–пачатку XIII ст.



Светаўладкаванне (або Новастворань свет). Дрэварыт з Бібліі Васіля Кораня 1692–1696 гг.

эпіграфаў – беларускія мысляры і творцы ад Сярэднявечча, Рэнесансу, Рэфармацыі, Асветніцтва да нашых дзён. Гэта ўсё дапамагае пабачыць, што ідэі і вобразы, на якіх грунтуецца старажытнае аўтэнтычнае мысленне, не знікаюць з развіццём культуры і прагрэсу, не адкідаюцца як аджылыя наўзбоч культуры, але працягваюць фарміраваць нацыянальны інтэлектуальны дыскурс, утвараючы непарарыўны культурны дыялог, супольны і індывідуальны роздум над асноўнымі пытаннямі, што вярэдзяць усе пакаленні нацыянальнай супольнасці. Такім чынам ствараецца аб'ёмная карціна беларускага светамыслення і светаадчування, якая заангажоўвае чытача, набліжае яго да разумення інтэлектуальнай глыбіні беларускай народнай філасофіі і складанасці нацыянальнай ідэнтычнасці.

У кнізе пяць частак: «Сам-насам з Сусветам» (Беларуская этнакасмалогія), «На Беларусі Бог жыве» (Беларуская этнатэалогія), «О чалавек, ніхто не змераў глыб тваю!» (Беларуская народная антрапалогія), «У агромністай такой грамадзе» (Грамадскі лад у светапоглядзе беларусаў), «Гэта скарб нам на вечныя годы» (Беларуская этнааксіялогія) і больш за 170 унутраных загалоўкаў.

Сёння ў Беларусі, як ніколі, акрэсліўся сацыяльны запыт на даследаванне нацыянальнай ідэнтычнасці і на асэнсаванае фарміраванне яе духоўна-светапоглядных асноў. У гэтым запыце значнасць і актуальнасць праекта «Беларуская этнафіласофія ў сістэме нацыянальнай культуры» відвочная. Ён можа стаць важным унёскам у сёняшні працэс інтэлектуальных і культурных зрухаў, што адбываецца ў краіне, дапаможа яму стаць больш усвядомленым, больш глыбокім і знайсці сваё месца ў сусветным часава-прасторавым кантэксце. НИ

# АВАНС НА БУДУЧЫНЮ



**Сярод таленавітых маладых навукоўцаў, якім прызначана стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2021 г., – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі Яўген Сакоўскі. Да вашай увагі – думкі маладога вучонага аб абранай прафесіі і планах на будучыню.**

Нельга сказаць, што я на працягу ўсяго жыцця марыў стаць філосафам. Хаця тэарэтычныя даследаванні пачалі цікавіць мяне падчас вучобы ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Па базавай адукацыі я палітолаг-менеджэр, скончыў бакалаўрыят і магістратуру па гэтым накірунку. І тут важна нагадаць пра кандыдацкі экзамен па філасофіі ў канцы навучання магістратуры, які быў здаены добра. На маю думку, гэта паўплывала на далейшае развіццё падзей.

Праз некаторы час мне патэлефанавала доктар філасофскіх навук, прафесар Яскевіч Ядвіга Станіславаўна, на той час дэкан Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі БДЭУ, і прапанавала паступіць у аспірантуру філасофскага напрамку. У выніку я яе скончыў, застаўся працаваць у Інстытуце філасофіі і пакуль ні разу не пашкадаваў аб гэтым. Можна абагульніць вышэйсказанае тым, што мая прафесія вызначылася праз злучэнне волі выпадку з пэўным унутраным адчуваннем сваіх здольнасцей.

Што да ролі настаўніка ці аўтарытэтнага навукоўца ў выбары прафесіі або навуковага напрамку, то відавочна, што яна вельмі важная, але ў той жа час яе нельга перабольшваць. Тым больш у галіне філасофіі. Ёсць меркаванне, што ўся гісторыя філасофіі – гэта адна вялікая спрэчка ўсіх са ўсімі, якая працягваецца прыблізна 2500 гадоў. Я часткова згодны з гэтай думкай. Калі б